**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за сакавік 2025 г.

## Мерапрыемствы да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

**15 сакавіка. Кобрын.** Для вучняў «Дзівінская сярэдняя школа» бібліятэка правяла гадзіну інфармацыі «Закон, па якім мы жывем». Была прадстаўлена відэапрэзентацыя «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь - асноўны Закон грамадства і дзяржавы».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 26 чал.

**15 сакавіка. Кобрын.** Бібліятэка для вучняў 5-6 класаў правяла круглы стол «Закон, па якому жыць», прыурочаны да Дня Канстытуцыі.

Філіял «Залеская сельская бібліятэка», 16 чал.

**15 сакавіка. Кобрын.** У бібліятэцы для выхаванцаў дзіцячага дома прайшла гадзіна інфармацыі «Канстытуцыя фундамент дзяржавы». Была падрыхтавана кніжная выстава «Канстытуцыя - гарант беларускай дзяржаўнасці».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 32 чал.

**18 сакавіка. Кобрын.** У рамках святкавання Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у чытальнай зале ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» для вучняў старэйшых класаў гімназіі г. Кобрына, Батчынскай сярэдняй школы, Кобрынскага ДПК і Кобрынскага ТЦСАН прайшлі мерапрыемствы: гадзіна прававеда «Конституция Республики Беларусь - основа единства нации», урок грамадзянскасці «Канстытуцыя - гарант беларускай дзяржаўнасці», гадзіна прававой інфармацыі «Закон, па якім жыве краіна», урок прававых ведаў «Мир права. Конституция Республики Беларусь». Гасцямі мерапрыемстваў сталі адвакаты юрыдычнай кансультацыі Кобрынскага района В. Ішкініна і Я. Кронда.

Установа, 128 чал.

**18 сакавіка. Кобрын.** Для вучняў школ г. Кобрына прайшоў цыкл мерапрыемстваў, прыўрочаных да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: патрыятычны ўрок «Мы - граждане Беларуси!», гадзіна прававой інфармацыі «Государство - это мы», гадзіна гісторыі «Конституция - гарант свободы человека и гражданина».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 56 чал.

## Мерапрыемствы да Дня праваслаўнай кнігі

**14 сакавіка. Кобрын.** Бібліятэка да Дня праваслаўнай кнігі для жыхароў і гасцей в. Залессе правяла духоўна-асветніцкія чытанні «Пост - радасць душы» з удзелам настаяцеля храма святых апосталаў Пятра і Паўла г. Кобрына Аляксандра Канцэвіча.

Філіял «Залеская сельская бібліятэка», 83 чал.

**14 сакавіка. Кобрын.** У бібліятэцы да Дня праваслаўнай кнігі прайшоў вусны часопіс «Праваслаўнае святло пад кніжнай вокладкай», госцем якога стаў настаяцель Свята-Серафімаўскага храма айцец Антоній.

Філіял «Арэхаўская сельская бібліятэка», 27 чал.

**14 сакавіка. Кобрын.** Бібліятэка да Дня Праваслаўнай кнігі арганізавала літаратурную гасціную «Кнігі, якія ўзвышаюць душу». Мерапрыемства прайшло з удзелам протаіерэя, айца Аляксандра Панасюка-настаяцеля Свята-Успенскай царквы в. Тэўлі.

Філіял «Тэвельская сельская бібліятэка», 30 чал.

**17 сакавіка. Кобрын.** У рамках праекта «От милосердия в книгах - к неравнодушию в жизни» прайшла гадзіна разважання «Духовное возрождение и православная книга». Госць мерапрыемства, протаірэй Валерый Барадзін пазнаёміў з самай галоўнай кнігай веруючых – Бібліяй. Надзея Момлік прачытала вершы на тэму Радзімы, праваслаўнай веры.

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 37 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**7 сакавіка. Кобрын.** У чытальнай зале ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» сумесна з Кобрынскім ТЦСАН прайшла інтэлектуальная гульня «Што? Дзе? Калі?».

Установа, 27 чал.

**7 сакавіка. Кобрын.** У чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы ў рамках Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам прайшла гадзіна актуальнай размовы «Сцяжынка, якая вядзе ў бездань» для вучняў СШ № 2 г. Кобрына.

Установа, 50 чал.

**10 сакавіка. Кобрын.** У рамках сумеснага праекта «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва» ў чытальнай зале ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» праведзена бясплатнае індывідуальнае кансультаванне грамадзян па натарыяльных пытаннях.

Установа, 10 чал.

**17 сакавіка. Кобрын.** У Маскоўскім доме нацыяльнасцей адбылося пасяджэнне Міжнароднага літаратурнага клуба імя Льва Таўстога, да якога далучыліся члены літаратурнага клуба «ПаэтыКа». Мерапрыемства пад назвай «Вайна і мір у гісторыі і літаратуры» адбылося ў рамках Міжнароднага праекта «Славянскі вянок: гістарычнае і культурнае адзінства славянскіх народаў».

Установа

**21 сакавіка. Кобрын.** Да Сусветнага дня паэзіі у чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшоў паэтычны зарапад «Я шукаю сваю душу ў вершах». Гасцямі мерапрыемства сталі Марына Міхалюк, член літаратурнага клуба «ПаэтыКа» і члены Народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Белы бусел» - Канстанцін Давідзюк і Наталля Сацута.

Установа, 29 чал.

Выканаўца
Чопік Д. І.
3 85 81